НОВЫЯ ІМЁНЫ



Фота БЕЛТА

Фота KRAJ.BY

# ТАЦЦЯНІН ДЗЕНЬ

Прадстаўніца Мінскай вобласці 23-гадовая Таццяна Валахановіч заваявала Гран-пры і прыз імя Уладзіміра Мулявіна на Нацыянальным конкурсе маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні. Заключны этап творчага спаборніцтва адбыўся на XV Нацыянальным фестывалі беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2015», які горад прымаў у мінулыя выхадныя.

Таццяна Валахановіч закончыла Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў, паступіла ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (завочнае аддзяленне). Цяпер працуе ў Дзяржынскім раёне кіраўніком эстраднай студыі «Галасы» ў сельскім Доме культуры. Дарэчы, у гэтым жа калектыве яна з дзяцінства займалася сама, сюды маладым спецыялістам вярнулася па размеркаванні пасля каледжа.

Удзел у Нацыянальным конкурсе маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні стаў для дзяўчыны самым сур'ёзным этапам у творчай кар'еры. Да гэтага былі перамогі на ўзроўні раённых конкурсаў. Таксама Таццяна была лаўрэатам радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі». Паводле яе слоў, перамога ў гэтым спаборніцтве стала для яе новай прыступкай у творчым жыцці, дадала ўпэўненасці ў сваіх сілах.

Першую прэмію і званне лаўрэата заваяваў Мікіта Касцюкевіч (Мінск). Другое месца дасталася Андрэю Цямчыку і Лізавеце Войтуль (абое — Брэсцкая вобласць). Уладальнікі трэцяга месца — Яўген Захарка (Гродзенская вобласць) і Дзмітрый Нікіцін (Мінск).

Ацэньвала канкурсантаў аўтарытэтнае журы, у складзе якога былі мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра прафесар Міхаіл Фінберг (старшыня журы), кампазітар Эдуард Зарыцкі, прадстаўнікі Міністэрства культуры. Ролю эксперта таксама прымерыла на сябе артыстка Алена Ланская. Паводле яе слоў, асноўная ўвага пры ацэнцы звярталася на вакальныя здольнасці, чысціню выканання, рэпертуар і яго адпаведнасць узросту спевака, а таксама знешні выгляд канкурсанта.

Для ўдзелу ў заключным этапе конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні ў Маладзечна прыехалі прадстаўнікі з кожнай вобласці і горада Мінска. Асаблівасць гэтага творчага спаборніцтва — выкананне песні беларускіх аўтараў на беларускай мове. Галоўная ідэя фестывалю — далучэнне да нацыянальных каштоўнасцей беларускай культуры, папулярызацыя роднай мовы і твораў беларускіх кампазітараў і паэтаў, адкрыццё новых імёнаў.

Ірына СВІРКО

# КУЛЬТУРА

ПРЭМ'ЕРА

## ОПЕРНЫ ХІТ

